Эканамічны рост аднаўляецца

Аграпрамысловы комплекс аздаровяць

Андрэй Кабякоў адзначыў, што падтрымка, якую атрымалі прадпрыемствы Мінпрама, дазволіла ў першым паўгоддзі нарасціць аб'ёмы прамысловай вытворчасці — 100,7% да леташняга ўзроўню, а па выніках сямі месяцаў — 101,4%. Практычна на 2 трлн недэнамінаваных рублёў скараціліся запасы гатовай прадукцыі на складах.

Таксама прэм'ер-міністр звярнуў увагу на тое, што дынамічна памяншаецца колькасць стратных арганізацый. За паўгоддзе іх стала менш на 31%. Але пры гэтым лічба ўсё яшчэ застаецца высокай — 1 738 арганізацый. А гэта вышэй за ўзровень мінулага года на чвэрць.

«Нягледзячы на зніжэнне колькасці стратных прадпрыемстваў у Мінпраме на 8% і ў два разы сумы страт, асноўная маса ўсіх страт канцэнтруецца менавіта ў прамысловасці — 46%», — дадаў прэм'ер-міністр.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ўрад паслядоўна рэалізуе праграму фінансавага аздараўлення ўсіх галін эканомікі «без уключэння друкарскага станка». Напрыклад, летась дзякуючы ёй вырашаліся праблемы машынабудавання, прадпрыемстваў перапрацоўкі і лёгкай прамысловасці. Сёлета асобую ўвагу нададуць аграпрамысловаму комплексу.

«У ліпені прыняты адпаведныя ўказы, дзе вызначаны канкрэтныя механізмы фінансавага аздараўлення сельгасарганізацый. У поўнай меры будзе задзейнічаны інструмент кіравання актывамі найбольш праблемных прадпрыемстваў», — растлумачыў Андрэй Кабякоў. Наступны этап — перапрацоўчыя прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу. Паводле слоў прэм'ер-міністра, кіраўніку дзяржавы накіраваны праект указа па развіцці такіх прадпрыемстваў у Віцебскай вобласці. Паралельна вядзецца работа па Гомельскай і Мінскай абласцях.

Пенсіі, спажывецкі кошык і стаўкі

Што тычыцца пенсій і дапамог, то, па словах прэм'ер-міністра, з гэтым праблем няма. У краіне яны выплачваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме. Пры гэтым, паводле яго слоў, не ў поўнай меры вырашана праблема своечасовай выплаты заработнай платы. «З гэтым урад працуе, прымаюцца жорсткія меры. Цэлы шэраг службовых асоб прыцягнуты да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці. Патрабаванні зробяцца больш жорсткімі. Кантрольны тэрмін выплаты запазычанасці — 20 жніўня», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Кошт спажывецкага кошыка ў Беларусі за сем месяцаў з пачатку года павялічыўся на 7,8%. Прэм'ер-міністр адзначыў, што інфляцыя запавольваецца штомесяц, пачынаючы з сакавіка. Другі месяц запар месячная інфляцыя знаходзіцца на ўзроўні 0,4%.

Таксама зніжаюцца працэнтныя стаўкі. Кіраўнік беларускага ўрада нагадаў, што прынята рашэнне з 17 жніўня знізіць стаўку рэфінансавання да 18%. Ён падкрэсліў, што ў першым паўгоддзі ўдалося ўвайсці ў запланаваны калідор па сярэдняй працэнтнай стаўцы па новых крэдытах у беларускіх рублях без уліку льготных. Сёлета ў чэрвені яна склала 27% гадавых.

«Гэта верхняя мяжа працэнтнай вілкі на канец 2016 года. Гэта ніжэй, чым па крэдытах снежня 2015 года на 6,3%. Пры гэтым звяртаю ўвагу, што працэнтная стаўка па ўсіх крэдытах (з улікам ільготных) у чэрвені склала 14,7%», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Таксама, паводле яго слоў, краіна дастаткова арганізавана прайшла дэнамінацыю, якой папярэднічала вялікая работа Нацыянальнага банка і ўрада. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што ў першым паўгоддзі рэалізаваны комплекс мер па кансалідацыі бюджэту на агульную суму каля 2 млрд дэнамінаваных рублёў. Зарэзерваваныя і адкладзеныя выдаткі на агульную суму 1,6 млрд, або 5,6% ад усіх выдаткаў кансалідаванага бюджэту.

Над экспартам яшчэ трэба папрацаваць

Прэм'ер-міністр нагадаў, што на пятым Усебеларускім народным сходзе прагучалі важнейшыя праграмныя ўстаноўкі. Мінэканомікі з зацікаўленымі структурамі практычна дапрацавалі праект праграмы, які будзе разгледжаны ў хуткім часе і ў пакеце з дэталёвым планам мер будзе рэалізаваны.

Паводле яго слоў, новая эканоміка павінна стварацца на базе высокапрадукцыйных працоўных месцаў з належным выкарыстаннем працоўных рэсурсаў. Пры гэтым найважнейшай задачай рэальнага сектара эканомікі быў і застаецца экспарт.

«За кошт зніжэння цаны на нафтапрадукты, прасядання рынку калійных угнаенняў за пяць месяцаў краіна недаатрымала экспартную выручку. Нягледзячы на штомесячны рост экспарту і тое, што ў фізічных аб'ёмах экспарт тавараў перавысіў леташні ўзровень на 1,1%, у поўным аб'ёме папоўніць гэтыя страты не атрымалася. Сальда знешняга гандлю склалася ніжэй прагнозу — па выніках паўгоддзя маем мінус 0,7% ВУП пры заданні плюс 0,2% па выніках года», — адзначыў ён. На думку прэм'ер-міністра, кампенсаваць неспрыяльную цэнавую кан'юнктуру можам толькі шляхам нарошчвання паставак прадукцыі ў натуральным выражэнні, што прапісана ва ўсіх праграмных дакументах.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

■ Парламенцкі дзённік

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«ЗРОБІМ УСЁ НЕАБХОДНАЕ, КАБ ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПРАЙШЛІ АДКРЫТА»

У ніжняй палаце парламента прайшла сустрэча яе кіраўніцтва з папярэдняй місіяй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) па назіранні за маючымі адбыцца ў нашай краіне парламенцкімі выбарамі. Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, падчас сустрэчы падкрэсліў: за апошні час пройдзены значны шлях па развіцці адносін паміж нашым парламентам і ПАСЕ.

— Наш дыялог выйшаў на новы, больш якасны ўзровень, — заявіў спікер ніжняй палаты. — Мы павінны паглыбляць наша супрацоўніцтва з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы. Думаю, што беларускія дэпутаты будуць больш актыўна ўключацца ў рэалізацыю бягучых праграм ПАСЕ.

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, канструктыўнае ўзаемадзеянне паміж дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і ПАСЕ падчас прэзідэнцкіх выбараў у 2015 годзе, а таксама супрацоўніцтва ў іншых кірунках паўплывала на тое, што Палата прадстаўнікоў запрасіла ПАСЕ назіраць за цяперашнімі парламенцкімі выбарамі ў нашай краіне.

Спікер ніжняй палаты звярнуў увагу назіральнікаў місіі ПАСЕ на той факт, што наша дзяржава праводзіць шматвектарны палітычны курс.

— У нас адкрытая палітыка, таму мы запрасілі назіраць за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкую асамблею СНД, Парламенцкую асамблею АДКБ і Парламенцкую асамблею АБСЕ, — паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ён звярнуў увагу, што беларускі бок нікога не абмяжоўваў у плане колькаснага складу гэтых місій і ў плане працягласці іх знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь.

— Несумненна, выбары ў Палату прадстаўнікоў — гэта вельмі важнае палітычнае мерапрыемства і для дзяржавы, і для беларускага грамадства, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Мы многае ў гэтым плане зрабілі і зробім усё неабходнае, каб выбары ў Палату прадстаўнікоў прайшлі адкрыта, празрыста, дэмакратычна, каб яны сапраўды адлюстроўвалі волю беларускага народа, каб увогуле ні ў кога — ні ў нашых назіральнікаў, ні ў нашых апанентаў — не было ніякіх сумненняў, і каб гэтыя выбары былі прызнаны міжнароднай супольнасцю.

Фота БЕЛТА.

Гаворачы пра рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ, выпрацаваныя па выніках прэзідэнцкіх выбараў мінулага года, старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў: у мэтах рэалізацыі гэтых рэкамендацый у нас была створана міжведамасная рабочая група.

— Па гэтым пытанні праведзена вялікая работа, — упэўнены Уладзімір Андрэйчанка. — На сёння прынята пастанаўленне Цэнтрвыбаркама, распрацаваны метадычныя рэкамендацыі для нашых акружных камісій, для ўчастковых камісій, у адпаведнасці з якімі замежным назіральнікам, нашым нацыянальным назіральнікам будзе дазволена прысутнічаць — пры ўмове іх акрэдытацыі ў акруговых камісіях — пры здачы пратаколаў участковымі выбарчымі камісіямі. Думаю, гэта вельмі важны момант у выбарчым працэсе. Акрамя гэтага, замежныя і нашы нацыянальныя назіральнікі могуць атрымліваць інфармацыю пра тое, колькі выбаршчыкаў унесена ў спісы, а таксама атрымліваць інфармацыю падчас датэрміновага галасавання. Прынята таксама рашэнне міжведамаснай групы і Цэнтральнай выбарчай камісіі, каб у дзень галасавання члены ўчастковых камісій і назіральнікі — як нацыянальныя, так і замежныя — размяшчаліся такім чынам, каб яны маглі рэальна бачыць працэдуру падліку галасоў па завяршэнні галасавання.

Кіраўнік місіі ПАСЕ Гізела ВУРМ заявіла, што рэалізацыя Беларуссю часткі рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ можа забяспечыць магчымасць празрыстага назірання за выбарамі.

Яна таксама праінфармавала, што ў склад місіі ўваходзяць прадстаўнікі Нарвегіі, Чарнагорыі, Арменіі, Францыі, Польшчы і Італіі. На яе думку, такая шматнацыянальнасць дэлегацыі — доказ таго, што ПАСЕ імкнецца быць непрадузятай у ацэнцы парламенцкіх выбараў у нашай краіне.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Жніво-2016

Чатыры тысячы не мяжа

Учора ў Магілёўскай вобласці ўшаноўвалі першых чатырохтысячнікаў сёлетняга жніва — камбайнераў адкрытага акцыянернага таварыства «Александрыйскае» Шклоўскага раёна Віктара Якуціна і Кірыла Волкава. Гэты экіпаж яшчэ тры дні таму віншавалі з першымі ў вобласці трыма тысячамі тон сабранага ўраджаю. І вось новы рэкорд. Непасрэдна пасярод поля, дзе яны працуюць, ім уручылі ганаровыя граматы, грашовыя прэміі і падарункі. Дарэчы, менавіта гэта поле ў народзе завуць «прэзідэнцкім», тут заўсёды на парадак вышэйшая ўраджайнасць. Лічба пакуль не агучваецца, але нават у цэлым па гаспадарцы яна менш як 50 цэнтнераў з гектара яшчэ не была.

Фота БЕЛТА.

— Гэты ўраджай будзе не з горшых. Дажджы крыху ўскладнілі работу, але на выніку гэта не вельмі паўплывала, — запэўнівае **намеснік дырэктара па раслінаводстве сельгаспрадпрыемства Іван БАРТАШЭВІЧ**.

Усяго збожжавымі і зернебабовымі ў гаспадарцы засеяна 4 669 га, вал атрымліваецца больш, чым цалкам у некаторых раёнах. «Ужо ўбрана больш за 70% плошчаў, на працягу 4-5 пагодлівых дзён заканчваем уборку і пераходзім да асенне-палявых работ — рыхтаваць палі да сяўбы пшаніцы, сеяць азімыя, убіраць салому, дапамагаць насельніцтву з уборкай», — дзеліцца планамі Іван Мікалаевіч.

Збожжа гаспадарка цалкам выкарыстоўвае для сваіх жа патрэб, яшчэ прыкладна столькі ж купляе, бо для кармлення птушкі, свіней і буйной рагатай жывёлы неабходна каля 60 тысяч тон збожжа.

Героі дня радуюцца ўраджаю, хоць, прызнаюцца, некалькі разоў было, што з-за дажджу прыходзілася на дзень ці нават на два рабіць перапынак. Расказваюць, што працуюць з 6 раніцы да 11 вечара амаль без перапынкаў. Пакуль стаіць добрае надвор'е, грэх адпачываць.

Падзякаваць за добрую работу на поле да хлебаробаў прыехалі старшыня Шклоўскага райвыканкама Аляксандр Бойка, старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Анатоль Ісачанка, супрацоўнік Магілёўскага абкама прафсаюза работнікаў АПК Пётр Грыбаноўскі.

— Мы адзіная вобласць краіны, дзе прафсаюзы ўсіх галін сабралі сродкі на заахвочванне тых, хто працуе на жніве. Атрымалася больш за 50 мільёнаў недэнамінаваных рублёў. Пры дасягненні 30% ўборачнай кампаніі ўзнагароджваем лепшых сярод экіпажаў, кіроўцаў, аператараў зернятокаў па кожным раёне, — кажа Пётр Грыбаноўскі.

Для падтрымання высокіх тэмпаў жніва ў вобласці існуе шмат розных форм заахвочвання. У некаторых раёнах падзячныя лісты ўручаюць не толькі пераможцам, але і іх сем'ям.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

УСЁ РЭАЛЬНА

Тавараабарот з Індыяй да 2018 года можа скласці $1 млрд

Па меркаванні Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Індыі ў нашай краіне спадара Панкаджа Саксены, гэта цалкам верагодна. Пра тое, на чым грунтуецца гэты прагноз, чаму Індыя цікавіцца беларускімі навуковымі распрацоўкамі і як плануецца адсвяткаваць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Індыяй, Пасол расказаў напярэдадні Дня Незалежнасці яго краіны, які святкуецца 15 жніўня.

— Пастаўленыя мэты грунтуюцца на тых звестках, якія ёсць, — заявіў спадар Панкадж Саксена, адказваючы на пытанне журналіста пра аб'ём тавараабароту. — І абодва бакі ведаюць, што такой сумы можна дасягнуць. Гэта цалкам верагодна. Таму Індыя і запрашае Беларусь да ўдзелу ў сваіх праграмах.

У прыватнасці дыпламат згадаў праграму «Make in India».

— Магу сказаць, што Беларусь уваходзіць у спіс 25 краін, якія ўрад Індыі вызначыў да ўдзелу ў сваіх праграмах, — паведаміў пасол. — Беларускі ўрад цяпер вывучае магчымасць удзелу ў гэтай праграме. Праграма «Make in India» ўключае ў сябе і абмен тэхналогіямі. Беларусь увайшла ў гэты спіс, таму што яна ў Індыі вядома па сваіх навукова-тэхнічных, машынабудаўнічых, абаронных распрацоўках.

Дыпламат патлумачыў, што гэты «спіс-25» паказвае, вопыт якіх краін асабліва цікавы Індыі з пункту гледжання тэхналогій.

* * *

Гаворачы пра супрацоўніцтва Індыі і Еўразійскага эканамічнага саюза, спадар Панкадж Саксена паведаміў: Індыя зацікаўлена ў падпісанні дагавора аб свабодным гандлі з ЕАЭС.

— Створана сумесная рабочая група па гэтым пытанні. Нядаўна ў Санкт-Пецярбургу прайшло адно пасяджэнне гэтай групы. Натуральна, у абмеркаванні ўдзельнічае і Беларусь, і мы цэнім вашу падтрымку. Мы ведаем, што беларускі бок жадае падпісаць дагавор у найкарацейшы тэрмін. Але, як правіла, падрыхтоўка такіх дагавораў займае пэўны час: ёсць вельмі шмат пунктаў, якія трэба ўзгадніць, — адзначыў ён.

* * *

Адказваючы на пытанне аб культурным супрацоўніцтве, пасол Індыі з задавальненнем канстатаваў: у Беларусі ведаюць, паважаюць і любяць індыйскую культуру, філасофію. Па яго інфармацыі, за мінулы год пасольства выдала 8 тысяч віз нашым грамадзянам, прычым прыкладна 6 тысяч з іх жадалі наведаць Індыю з турыстычнымі мэтамі.

Спадар Панкадж Саксена звярнуў увагу і на той факт, што ўжо ў 2017 годзе беларуска-індыйскім дыпламатычным адносінам споўніцца 25 гадоў. Ён паабяцаў запрасіць на гэтае свята вядомую індыйскую групу.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Партнёры

НЯМА ЗАКРЫТЫХ ТЭМ

Як адносіны паміж дзвюма краінамі садзейнічаюць тавараабароту

У нас прынята лічыць самымі блізкімі і нават роднаснымі па духу постсавецкія краіны. Аднак і ў больш заходнім накірунку ў Беларусі ёсць сапраўдныя сябры. У Сербіі наш народ ведаюць і любяць. Тое, што Сербія блізкая да ўступлення ў Еўрапейскі саюз, а Беларусь — адна з дзяржаў-заснавальнікаў ЕАЭС, не перашкаджае адносінам заставацца не проста партнёрскімі, а сяброўскімі. Пра тое, як і чым жыве сучасная Сербія, якія кірункі цікавыя для супрацоўніцтва бізнесменаў дзвюх краін і якое значэнне для Сербіі мае членства Беларусі ў ЕАЭС, «Звяздзе» расказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь спадар Велька КАВАЧАВІЧ.

Арыентацыя на паляпшэнне жыцця

— 90-я гады, пачатак 2000-х выдаліся цяжкімі для вашай краіны. Як удаецца пераадольваць наступствы вайны, бамбёжак? Што сабой уяўляе сучасная Сербія?

— Войны, бамбёжкі і санкцыі мелі цяжкія наступствы для нашай эканомікі. Пасля 2000 года ў дачыненні да Сербіі была ўжыта так званая «неаліберальная» канцэпцыя, якая ўключала рабаўніцкую прыватызацыю.

У такіх цяжкіх умовах урад Рэспублікі Сербія на чале з прэм'ерам Аляксандрам Вучычам правёў рашучыя і маштабныя эканамічныя рэформы. Гэта ўжо дало свае пазітыўныя вынікі, пацверджаныя такімі арганізацыямі, як Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк.

Відавочным з'яўляецца аднаўленне эканомікі краіны як у кароткатэрміновай, так і ў доўгатэрміновай перспектыве. Сёлета чакаецца рост ВУП на ўзроўні 2,5%. Паступова памяншаецца памер дзяржаўнага доўгу Сербіі. Наша краіна стала дастаткова прывабнай для замежных інвестыцый, у прыватнасці, кітайская кампанія нядаўна прыватызавала вялікі металургічны завод у сербскім горадзе Смедзерава. Такім чынам, сучасная Сербія арыентавана на ўмацаванне сваёй эканомікі і павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

— Доўгі час практычна ў самым цэнтры Белграда стаяла некалькі разбураных пры бамбёжцы 1999 года будынкаў. Казалі, што яны так і застануцца стаяць — як напамін аб вайне, своеасаблівы мемарыял. Але ў 2013 годзе адзін з будынкаў пачалі разбіраць... Які лёс астатніх?

— Сербія з належнай увагай і глыбокай павагай ставіцца да ахвяр агрэсіі НАТА. На месцах пакут нашых грамадзян узведзена вялікая колькасць мемарыялаў і помнікаў. Што да будынкаў у цэнтры Белграда, то некаторыя з іх у асноўным адноўлены. Будуць адноўлены і астатнія, гэта залежыць ад наяўнасці матэрыяльных сродкаў і ад прызначэння асобных аб'ектаў.

— Якую падтрымку аказвае ўрад Сербіі сваім грамадзянам?

— Прыярытэтам нашай сацыяльнай палітыкі з'яўляецца абарона правоў і інтарэсаў грамадзян. У Сербіі існуе роўнасць правоў мужчын і жанчын ва ўсіх сферах дзейнасці, у тым ліку ў адукацыі і працы, выхаванні дзяцей, атрыманні льгот і сацыяльных гарантый. Тым не менш існуюць праблемы ў прадастаўленні адраснай дапамогі інвалідам, адзінокім маці, маламаёмасным грамадзянам, мігрантам і перасяленцам.

Захад ці Усход?

— Ідуць актыўныя перамовы па далучэнні вашай краіны да Еўрапейскага саюза. Што плануе атрымаць Сербія ў выніку ўваходжання ў гэта аб'яднанне?

— Знешнепалітычным прыярытэтам Сербіі з'яўляецца паўнапраўнае членства ў ЕС. Нагадаю, Сербія падала заяўку на ўступленне 22 верасня 2009 года. Еўрапейская камісія ў мінулым лістападзе дала высокую ацэнку намаганням Сербіі ў набліжэнні да еўрапейскіх стандартаў, аднак адзначыла неабходнасць прывесці знешнюю палітыку краіны ў адпаведнасць з палітыкай Еўрасаюза.

Апошні з'яўляецца асноўным гандлёвым партнёрам Сербіі. Прамыя замежныя інвестыцыі з краін ЕС склалі значную частку ад агульнай колькасці прамых замежных інвестыцый у Сербіі. Акрамя гэтага, ЕС — самы буйны донар, які аказвае фінансавую дапамогу ў розных галінах эканомікі — ад рэформы дзяржаўнага кіравання да сельскай гаспадаркі і аховы навакольнага асяроддзя.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аднак пры гэтым хачу падкрэсліць, што мы імкнёмся не толькі захоўваць, але і развіваць адносіны з нашымі традыцыйнымі партнёрамі, такімі, як Беларусь, Расія, Кітай.

— Наколькі Сербіі важна развіваць супрацоўніцтва з постсавецкімі краінамі?

— Сербія не далучылася і не далучыцца да санкцый у адносінах да Расійскай Федэрацыі. Ужо даўно падпісаны пагадненні аб свабодным гандлі з Беларуссю, Расіяй, Казахстанам, а пасля і з Мытным саюзам у цэлым. У хуткім часе пачнуцца перамовы паміж Сербіяй і ЕАЭС аб падпісанні Пагаднення аб свабодным гандлі. Трэба таксама асобна падкрэсліць, што з большасцю постсавецкіх краін Сербія мае традыцыйна добрыя і сяброўскія адносіны ва ўсіх сферах.

Умовы для агульнага бізнесу

— Якое значэнне для бізнес-колаў Сербіі мае членства Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе?

— Беларусь у Сербіі вядомая як вельмі сур'ёзны і надзейны гандлёвы партнёр. Прысутнасць сербскіх кампаній на беларускім рынку забяспечыць ім выхад на рынкі краін ЕАЭС. Прывяду адзін прыклад: група сербскіх кампаній «БК-груп» і «Дана холдынгс», якія будуюць шматфункцыянальныя комплексы «Мінск-Мір» і «Маяк Мінска», таксама паспяхова ажыццяўляюць сваю дзейнасць як у ЕАЭС, так і ў іншых постсавецкіх краінах.

— Як у Сербіі ацэньваюць беларускі бізнес-клімат?

— Ён вельмі спрыяльны. Беларускія партнёры — надзейныя, з імі можна разлічваць на доўгае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. Нядаўна адна сербская кампанія набыла ў Заслаўі неэксплуатуемы будынак з мэтай запусціць новую вытворчасць.

— Чым цікава Беларусь для сербскіх інвестараў? Чым прывабная Сербія для беларускіх бізнесменаў?

— Беларусь знаходзіцца ў сэрцы Еўропы. Яна не толькі захавала, але і пастаянна развівае свой прамысловы патэнцыял.

Узаемную цікавасць для нашых краін у першую чаргу ўяўляе стварэнне сумесных прадпрыемстваў, такіх як «MAZ-Balkan» (сумеснае прадпрыемства Мінскага аўтамабільнага завода і сербскай кампаніі Vulovic Transport), «Беларус Аграпанонка» (сумеснае прадпрыемства Мінскага трактарнага завода і кампаніі «Аграпанонка»).

Што да дзелавога ўзаемадзеяння прадстаўнікоў бізнес-колаў Сербіі і Беларусі, магу адзначыць, што пасяджэнне Дзелавога савета па супрацоўніцтве Гаспадарчай палаты Сербіі і Беларускай гандлёва-прамысловай палаты прайшло дастаткова паспяхова і адкрыла новыя магчымасці доўгатэрміновага супрацоўніцтва. У сербскай дзелавой дэлегацыі налічвалася больш за 100 бізнесменаў, якія правялі перамовы з беларускімі партнёрамі. Вынік перамоў — падпісанне дагавораў аб некалькіх новых праектах. Мотавелазавод і сербская кампанія «TRAYAL Карпарацыя» падпісалі кантракт на пастаўку пакрышак і камер для матацыклаў на суму 100 тысяч еўра. Бакі дамовіліся аб сумеснай вытворчасці аўтобусаў з беларускімі камплектуючымі, зборка якіх будзе здзяйсняцца ў Сербіі, а продаж — як у Сербіі, так і на рынках іншых еўрапейскіх дзяржаў.

Шматфункцыянальны комплекс «Мінск-Мір» — буйнейшы на сення будаўнічы праект у Еўропе. Ён разлічаны на 10 гадоў. За гэты час сербская кампанія «Дана Холдынгс» плануе ўзвесці 3 мільёны квадратных метраў жылых і офісных плошчаў. У першую чаргу будуць пабудаваны аб'екты сацыяльнай інфраструктуры — жыллё, школы, дзіцячыя садкі, спартыўныя пляцоўкі, медыцынскія ўстановы, гандлёва-забаўляльны комплекс і фінансавы цэнтр.

Да 2017 года плануецца завяршыць будаўніцтва яшчэ аднаго шматфункцыянальнага комплексу — «Маяк Мінска». Ен стаў першым праектам падобнага тыпу ў Беларусі, удастоеным міжнародных прэмій. Так, яго прызналі лепшым шматфункцыянальным комплексам ва Усходняй Еўропе.

Што да прывабнасці Сербіі для беларускіх бізнесменаў, то кампанія «Белаўтагаз» зацікавілася інвеставаннем у сербскую кампанію «Петар Драпшын».

Сербія можа таксама быць цікавай беларусам як турыстычны кірунак. Гэта можа быць гарадскі турызм (тур выхаднога дня), рэлігійны турызм. Сербія вядома сваімі старажытнымі гарадамі з крэпасцямі і манастырамі. Шмат у нас ёсць тэрмальных крыніц, вядомых сваімі гаючымі якасцямі, лячэбна-аздараўленчых курортаў, якія спецыялізуюцца на лячэнні розных захворванняў.

— Тавараабарот паміж Беларуссю і Сербіяй паступова павялічваецца: рост быў адзначаны і летась, адзначаецца і сёлета. Што дапамагае нашым краінам развіваць супрацоўніцтва?

— Сапраўды, згодна са звесткамі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, аб'ём тавараабароту паміж Беларуссю і Сербіяй у 2015 годзе склаў 253,3 мільёна долараў ЗША. Рост у параўнанні з 2014 годам — 3,4%. Пры гэтым аб'ём беларускага экспарту — 144,7 мільёна долараў, а імпарту — 108,6 мільёна долараў.

Асобна хачу падкрэсліць, што паміж Сербіяй і Беларуссю існуюць традыцыйна добрыя, сяброўскія адносіны, заснаваныя на агульнай гісторыі, веры, духоўнай блізкасці. Найлепшым чынам характарызуюць адносіны паміж нашымі краінамі рэгулярныя сустрэчы нашых прэзідэнтаў Таміслава Нікаліча і Аляксандра Лукашэнкі. Трэба адзначыць таксама і рэгулярныя сустрэчы на высокім узроўні. Напрыклад, міністра эканомікі Сербіі Жэлькі Серціча з прэм'ер-міністрам Беларусі Андрэем Кабяковым, міністрам гандлю Уладзімірам Калтовічам і міністрам прамысловасці Віталём Воўкам, сустрэчы кіраўніцтваў абаронных ведамстваў, мэраў сталіц абедзвюх краін.

Такому інтэнсіўнаму ўзаемадзеянню паміж нашымі краінамі дапамагае рэгулярны прамы рэйс, што здзяйсняецца авіякампаніяй «Белавія», а таксама бязвізавы рэжым.

Для дыялогу Беларусі і Сербіі не існуе тэмы, якая была б «забаронена», гэта значыць закрыта для супрацоўніцтва. Наадварот, дзве краіны адкрыты для развіцця ўзаемадзеяння па ўсіх магчымых кірунках.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

В **суд Центрального района г. Гомеля** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим МАРМУРОКА Георгия Георгиевича, 18 декабря 1969 года рождения, последнее время проживания и последнее время пребывания по адресу: г. Гомель, ул. Кирова, д. 59, кв. 5. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить их суду Центрального района г. Гомеля по адресу: г. Гомель, ул. Пушкина, д. 10, каб. 19 или по телефонам: 77-44-04, 77-68-70.

Сведения принимаются в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Закрытое акционерное страховое общество «Промтрансинвест» объявляет о недействительности следующих бланков:
- обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВА №№ 5670715–5670730 (16 шт.);
- квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№ 0379822–0379840 (19 шт.);
- добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА №№ 0968065–0968195 (131 шт.);
- комбинированного жилищного страхования формы 2РН серии ПК №№ 013513–013516 (4 шт.);
- карт международного моторного страхования (страховые сертификаты «Зеленая карта») серии BY/07 №№ 12334886–12334915 (30 шт.);
- универсальных страховых полисов формы 2 РН, 2РП серии ПЕ №№ 0229837–0229840, 0240396 (5 шт.), выписанных после 20 апреля 2016 г.

УНП 100357923

УП «Проектный институт Белгипрозем»
ПРИГЛАШАЕТ ВАС ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ПРОВЕДЕНИЯ РАБОТ
ПО МОДЕРНИЗАЦИИ ПОМЕЩЕНИЯ СКЛАДА
Предмет закупки – разработка проектно-сметной документации по модернизации здания склада, расположенного по адресу: **г. Минск, ул. Казинца, 86Б/1** согласно акту обследования № 1 от 29.07.2016 г.
Примерный перечень видов строительных работ (акт обследования можно получить у специалистов предприятия):
- Бейсова Г.Б. – тел. 207 05 33;
- Лукашевич А.Ф. – тел. 207 05 33.
Переговоры будут проведены без предварительного квалификационного отбора.
Срок выполнения работ – август 2016 года.
Время проведения переговоров – 16 августа в 11 часов.
Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: 207 05 33, 212 07 00.
УНП 100035563